Комплекснае **даследаванне фальклору і этнакультуры Палесся:** Матэрыялы II Міжнароднай навуковай фальклорна-этналінгвістычнай канферэнцыі, Мінск, 14-15 крас. 2005 г. / Рэдкал. Васіль Ліцвінка (уклад.) [і інш.]. Мн.: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2005. 338 с

У Выдавецкім цэнтры БДУ выйшаў у свет зборнік матэрыялаў II Міжнароднай навуковай фальклорна-этналінгвістычнай канферэнцыі, што адбылася ў Мінску 14-15 красавіка 2005 г. Арганізатары - навукова-даследчая лабараторыя (НДЛ) беларускага фальклору БДУ пры ўдзеле кафедры беларускай літаратуры і культуры і кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта БДУ - прысвяцілі дадзенае навуковае мерапрыемства 220-годдзю з дня нараджэння Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага (1784-1825). У зборніку змешчана 68 артыкулаў розных аўтараў.

Тэма канферэнцыі - даследаванне фальклору і этнакультуры Палесся, надзвычай своеасаблівага рэгіёна, скарбніцы даўняй (шмат у чым дахрысціянскай) культуры. Актуальнасць падобных штудый прадвызначана не толькі звыклай у сучасным свеце глабалізацыяй, але Чарнобыльскай катастрофай, бо менавіта Палессе найбольш пацярпела ад яе

наступстваў, найбольш страціла і найбольш страціць у прышласці.

Укладальнік зборніка - вядомы беларускі фалькларыст Васіль Ліцвінка - падае матэрыял у адпаведнасці з тэматычным падзелам дакладаў на чатырох секцыях. Першы раздзел прысвечаны З. Даленгу-Хадакоўскаму, які можна лічыць сур'ёзнай калектыўнай спробай распачаць вялікую і пачэсную справу вяртання спадчыны Вялікага Славяніна, называўшага сябе «случаком». І гэта нягледзячы на тое, што за выключэннем артыкула светлай памяці Анатоля Аксамітава іншыя матэрыялы раздзела - толькі першыя крокі на шляху да асэнсавання навуковай спадчыны З. Даленгі-Хадакоўскага. Як піша М. Прыгодзіч, «паспела неабходнасць унесці істотныя карэктывы ў праграмы і непасрэдна вучэбны курс гісторыі беларускага мовазнаўства <...> як блізкая перспектыва бачыцца і грунтоўнае выданне навуковых прац З. Даленгі-Хадакоўскага» (с. 30).

Думаецца, што гэта будзе зроблена. Бо З. Даленга-Хадакоўскі, як адзначаў А. Аксамітаў, «упершыню ў мовазнаўстве вылучыў беларускую мову сярод іншых славянскіх моваў, вызначыў яе фанетычныя, граматычныя і лексічныя асаблівасці, арэал распаўсюджвання <...> прызнаваў самастойнасць беларускай мовы, надзеленай, на яго думку, нацыянальна-спецыфічнымі рысамі» (с. 4). Больш за тое, менавіта З. Даленга-Хадакоўскі паслядоўна называў мову крывічан беларускаю, што, відавочна, паспрыяла станаўленню беларускай нацыянальнай ідэі. Праўда, мы не можам пагадзіцца з думкай, якую выказаў у сваім выступленні А. Ільін: маўляў, польскія пецярбургскія панславісты 20-40-х гг. XIX ст. прыйшлі да высновы, што Беларусь і Украіну не ўтрымаць у арбіце польскай культуры, але яны не хацелі, каб гэтыя краіны ператвараліся ў вялікарускія правінцыі, а таму садзейнічалі развіццю беларускай і ўкраінскай культур (с. 16-17). Усё ж такі навуковая гіпотэза мусіць грунтавацца на пэўных матэрыялах, а не на допушчэннях і фантазіі даследчыка (А. Ільін нічым не пацвярджае свае выказванні). Спачатку дакументы, а пасля на іх базе канцэпцыя. І ніколі наадварот.

Падобны ненавуковы падыход заўважаецца і ў артыкуле С. Судніка. Сапраўды, індаеўрапейская метадалогія З. Даленгі-Хадакоўскага на сучасным этапе ў Беларусі не развіваецца і не можа развівацца - няма спецыялістаў, няма знаўцаў санскрыту. Аматарам не тое, што вырашыць, але нават паставіць дадзеную праблему не пад сілу. Закіды С Судніка «афіцыйнай навуцы», якая «не збіраецца хоць неяк прызнаць ці абвергнуць» (с. 35) тэзіс «пра наш прыход з Індыі», нельга назваць слушнымі. Што прызнаваць ці аспрэчваць? Дапушчэнні аматара, выказаныя ім у рэдагаванай ім жа самім газеце? Дапушчэнні, зробленыя без спасылак на навуковыя выданні? Гіпотэза С. Судніка, зусім верагодна, перспектыўная; больш за тое, мы з'яўляемся прыхільнікамі гэтай, няхай сабе і ненавуковай гіпотэзы. Але, думаецца, патрэбна праца вучоных цягам некалькіх дзесяткаў гадоў, каб дадзеныя ідэі набылі статус навуковай гіпотэзы. С. Суднік хоча ўсё і зараз! Дзеля гэтага ён спасылаецца на аўтарытэт З. Даленгі-Хадакоўскага. А ён жа, мне здаецца, пісаў пра Індыю як прарадзіму ***і славян,*** а не толькі славян, а не толькі беларусаў.

У наступных трох раздзелах («Пстарыяграфія фальклору і этнакультуры Палесся», «Фальклор у этнакультуралагічных даследаваннях», «Месца этналінгвістыкі ў культуралагічных даследаваннях») асвятляюцца разнастайныя аспекты вывучэння фальклору і этнакультуры Палесся: абрады, магія і вусная народная творчасць (Р. Казакова, Л. Раманава, Т. Акінчыц, М. Котаў), палескае абразапісанне (Ю. Хадыка), дойлідства і архітэктура (Г. Шымялевіч), палескія прымхі, забабоны, замовы, прыродазнаўчыя веды (К. Шумскі, С. Вяргеенка, А. Кастрыца, М. Леўкавец), палескае вяселле (Т. Шамякіна, В. Прыёмка, В. Новак, Т. Шаўчэнка), археалагічныя помнікі (В. Белявец, Г. Бяліцкая), строі, тканіны, ручнікі (Г. Барвенава, В. Лабачэўская, А. Бохан). У полі зроку навукоўцаў прысвечаныя гэтаму рэгіёну працы і мастацкія творы вядомых вучоных і пісьменнікаў мінулага: О. Кольбера, К. Машынскага (А. Баршчэўскі), Ю.І. Крашэўскага (В. Бобрык), С Дваракоўскага (А. Энгелькінг), Я. Коласа (А. Бельскі, А. Шамякіна), Л. Калюгі (Л. Алейнік), Я. Янішчыц (Т. Нуждзіна), Б. Сачанкі (С. Явар), беларускіх эміграцыйных даследчыкаў (Н. Баршчэўская), В. Вярэніча (Ф. Клімчук) ды інш.

Пераважная большасць матэрыялаў зборніка наўпрост ці апасродкавана звязана з тэмай Палесся, даследаванне фальклору і этнакультуры якога вядзе НДЛ беларускага фальклору БДУ. Аднак некаторыя артыкулы трапілі ў зборнік, відаць, выпадкова. Напрыклад, якое дачыненне да фальклору і этнакультуры Палесся мае опус А. Шылава «Основы славянской цивилизации»? За якія навуковыя вартасці рэдкалегія ўхваліла да друку гэты негатыўна ўспрыняты на пасяджэнні секцыі антысеміцкі даклад, зачытаны часткова (пакуль прысутныя дазволілі!) не аўтарам, а яго прадстаўніком - малайцом з фашысцкаю атрыбутыкай на вопратцы. Няўжо нельга адрозніць навуковае даследаванне і палітычны памфлет, прасякнуты шавіністычнай ідэалогіяй? Думаю, што З. Даленга-Хадакоўскаму было б сорамна за нашчадкаў, якія, прыкрываючыся яго імем, прапагандуюць рэлігійную і нацыянальную нецярплівасць, заклікаюць «правителей» беларускага народа «очистить традиции исконной общинной государственности от метастаз привнесенного сионом коммунизма, подживить и осовременить эти традиции» (с. 133). Гэтая лыжка дзёгцю тым больш прыкрая, што псуе святую справу - даследаванне духоўнай культуры Палесся.

***М.В. Хаўстовіч,***
кафедра гісторыі беларускай літаратуры